# ПЛЕНАРНЫЕ ДОКЛАДЫ

## СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ НАВУЧАННЯ: РАСПРАЦОЎКА ЭЛЕКТРОННАГА АДУКАЦЫЙНАГА РЭСУРСУ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)”

*Дапіра Т. П., Наўроцкая І. В.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Раскрываюцца паняцці інавацыйнага працэсу, дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій, электроннага адукацыйнага рэсурсу (ЭАР), актыўнай навучальнай дзейнасці. Разглядаюцца асаблівасці распрацоўкі ЭАР па дысцыпліне “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” у кантэксце рэалізаваных адукацыйных тэхналогій.

Ва ўмовах абнаўлення зместу адукацыі асаблівую значнасць і актуальнасць набывае праблема інавацыйных працэсаў у сістэме вышэйшай школы. Інавацыйны працэс уяўляе сабой стварэнне, распаўсюджанне і выкарыстанне сукупнасці новых ідэй і прапаноў, якія патэнцыяльна могуць быць здзейсненыя і пры умове маштабнасці іх выкарыстання і эфектыўнасці вынікаў могуць стаць асновай любой навацыі [1, с.267]. Распрацоўка інавацыйных тэхналогій навучання становіцца асабліва значнай ў сувязі з тым, што сучасныя глабальныя падзеі сацыяльнага жыцця паскорылі развіццё і выкарыстанне тэхналогій дыстанцыйнага навучання.

Спецыфіка дыстанцыйных адукацыйных тэхналогіі заключаецца ў выкарыстанні інфармацыйна-камунікацыйных методык, якія дапамагаюць ажыццяўляць узаемадзеянне выкладчыка і навучэнцаў праз сістэму электроннага навучання [2]. У сваю чаргу сістэма электроннага навучання ўяўляе сабой якасна распрацаваны лічбавы асяродак для набыцця ведаў, фарміравання ўменняў і навыкаў, ажыццяўлення кантролю і самакантролю і пад. У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі названае электроннае асяроддзе для арганізацыі працэсу навучання ў розных формах (дыстанцыйнай, завочнай, дзённай) праводзіцца на платформе Moodle, дзе вучэбная дзейнасць актывізуецца праз выкарыстанне электронных адукацыйных рэсурсаў (ЭАР). Ніжэй разгледзім асаблівасці распрацоўкі ЭАР па дысцыпліне “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”.

Адзначым, што ў 2013 – 2020 навучальных гадах у БДУІР выкладалася вучэбная дысцыпліна “Беларуская мова (культура маўлення)”. З 2021 навуч. г. была ўведзена дысцыпліна “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” паводле новых тыпавой і вучэбнай праграм трэцяга пакалення. Вучэбная праграма распрацаваная старшым выкладчыкам кафедры Наўроцкай І. В. з улікам паглыбленай інфарматызацыі грамадства, актыўнага развіцця сферы інфармацыйных тэхналогій, найноўшых дасягненняў айчыннай і замежнай лінгвістычнай навукі. Так, у праграму ўведзены тэарэтычныя раздзелы, якія датычацца:

- электроннага этыкету,
- этыкі навуковых даследаванняў,
- узаемасувязі лінгвістыкі і дакладных навук,
- распрацоўкі праграмных сродкаў для вырашэння лінгвістычных задач,
- асаблівасцей маўленчых паводзінаў перад камерай і мікрафонам,
- падрыхтоўкі да выступлення па відэасувязі і шэраг іншых.

Пералічаны вышэй сучасны тэматычны матэрыял паслядоўна і сістэмна адлюстроўваецца ў ЭАР па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”.

Пры распрацоўцы названага ЭАР рэалізуецца *модульны падыход* да навучання, які заключаюцца ў тым, што 16 тэм вучэбнай праграмы падзелены на цэласныя і сістэмныя навукова-тэматычныя падраздзелы (модулі). Кожны модуль мае сваю назву, сфармуляваныя мэты і задачы навучання, апісанне паслядоўнасці дзеянняў для паспяховага авалодання тэмамі модуля. У тым ліку ЭАР мае наступную структуру, паводле якой кожны модуль утрымлівае:

- *тэарэтычныя звесткі*,
- матэрыялы для *практычнага* замацавання,
- *сродкі кантролю* і самакантролю (тэсты, кантрольныя заданні, пытанні).

Акрамя гэтага, ЭАР па “Беларускай мове (прафесійнай лексіцы)” утрымлівае заключны *кантрольна-дыягнастычны модуль*, куды ўключаны кантрольныя работы, матэрыялы да заліку, выніковыя тэсты, электроннае апытанне (анкетаванне) для рэфлексіі.

Адзначым метадалагічныя асновы, якія выкарыстоўваюцца пры распрацоўцы структурных элементаў модуля ЭАР. Так, *тэарэтычныя матэрыялы* распрацоўваюцца, як было ўказана вышэй, з улікам сучасных

дасягненняў айчыннай і замежнай лінгвістычнай навукі. Таксама пры выкладзе тэарэтычных звестак рэалізуюцца не толькі ***міжпрадметныя сувязі*** (па гісторыі, культуралогіі, этнаграфіі, літаратуры і інш.), але і актыўна выкарыстоўваецца ***метапрадметны падыход*** да навучання [4], які спрыяе фарміраванню здольнасці вучыцца, займацца самаадукацыяй, самастойна здабываць веды і ўмець іх прымяняць на практыцы ў розных жыццёвых сітуацыях. Прафесійна арыентаванае навучанне беларускай мове ў тэхнічнай вну пры разглядзе канкрэтных моўных з’яў як раз і павінна спрыяць выпрацоўцы ўменняў назіраць, сістэматызаваць, рабіць высновы, крытычна ацэньваць, якія спатрэбяцца ў далейшым навучанні.

Заданні даследчага, праблемна-пошукавага характару, якія прапануюцца для выканання ў частцы з *практычнымі заданнямі* (прыкладна па 2 на кожную тэму), удакладняюць засвоеныя тэарэтычныя звесткі, што спрыяе іх актуалізацыі і лепшаму замацаванню, а таксама рэалізуюць ***праектную тэхналогію*** ў навучанні.

Сродкі *кантрольна-дыягнастычнай часткі* кожнага модуля, а таксама заключны модуль дазваляюць вызначыць, якія кампетэнцыі сфарміраваліся пры засваенні модуля, а якія падлягаюць карэкцыі. У ЭАР такім чынам рэалізуецца ***кампетэнтнасны падыход*** на навучання.

Істотна звярнуць увагу на тое, што прафесійная беларускамоўная падрыхтоўка будучых спецыялістаў ажыццяўляецца ва ўмовах практычна нераўнапраўнага двухмоўя, дзе перавага ў рэалізацыі камунікатыўных мэт належыць рускай мове. З гэтай прычыны неабходна клапаціцца пра стварэнне паўнавартаснага беларускамоўнага асяроддзя ў ЭАР. Гэта можна рэалізаваць пры дапамозе размяшчэння спасылак на адукацыйныя мультымедыйныя файлы (аўдыя, відэа, агучаныя прэзентацыі і інш.), заданняў на прагляд навучальных відэафільмаў, перадач (напрыклад, фільм “Першадрук”, прысвечаны Францыску Скарыну, адукацыйную гульню “Сваімі словамі”, навукова-пазнавальныя перадачы “Дыяблог пра мову”, “Дыяблог пра літаратуру” і інш.). Інфармацыя, прадстаўленая ў форме мультымедыя (маўленне, музычныя кампазіцыі, анімацыя), спрыяе эфектыўнаму засваенню матэрыялу, уключэнню ў працэс маўлення, паколькі задзейнічаныя розныя віды памяці – зрокавая і слыхавая. Такім чынам, *мультымедыйныя тэхналогіі* ў **тэарэтычнай і практычнай частках** модуляў ЭАР інтэнсіфікуюць працэс навучання, робяць яго цікавым і наглядным.

Увага да сістэмы новых метадычных тэхналогій паспрыяла складанню ЭАР па беларускай мове такім чынам, каб зарыентаваць студэнтаў на эфектыўнае авалоданне неабходнай інфармацыяй, фарміраванне прафесійных кампетэнцый, каб стымуляваць актыўнасць навучальнай дзейнасці. Актыўнасць у навучанні мове - інтэнсіўнасць накіраванасці студэнта на вучэбную дзейнасць; дыдактычны прынцып, які патрабуе такой пастаноўкі працэсу навучання, пры якой навучэнец становіцца суб'ектам пазнавальнай дзейнасці, якая, у сваю чаргу, выхоўвае ініцыятыўнасць, самастойнасць у засваенні ведаў, уменняў і навыкаў, у развіцці мыслення, маўлення, памяці, творчага ўяўлення. Актыўнасць навучання мове забяспечваецца прымяненнем інавацыйных метадаў работы, абсталявання, сучасных дапаможнікаў. У цяперашні час яна разумеецца як "здабыванне" ведаў, як даследаванні самога навучэнца; пры гэтым уводзіцца паняцце "ступень пазнавальнай актыўнасці і самастойнасці" [5].

Паколькі для паспяховай рэалізацыі працэсу навучання па дысцыпліне “Беларуская мова (культура маўлення)” на кафедры агульнаадукацыйных дысцыплін Наўроцкай І. В. распрацоўваўся электронны вучэбна-метадычны комплекс (ЭВМК), ёсць магчымасць параўнаць і выявіць некаторыя прынцыповыя адрозненні, якія маюць друкаваныя вучэбныя, электронныя вучэбна-метадычныя комплексы і ЭАР:

1. інтэрактыўнасць – магчымасць ЭАР хутка рэагаваць на зменлівыя патрабаванні да навучання;
2. інтэграцыя – магчымасць уключэння ў склад ЭАР спасылак на разнастайныя іншыя электронныя крыніцы інфармацыі;
3. актуалізацыя – магчымасць своечасовага абнаўлення і дапаўнення вывучаемага матэрыялу;
4. адаптацыя – магчымасць ЭАР арыентавацца на індывідуальныя асаблівасці і здольнасці студэнтаў, спецыфіку розных факультэтаў, спецыяльнасцей, на разнастайныя формы кантролю і арганізацыі самаадукацыі;
5. нагляднасць – выкарыстанне мультымедыйных тэхналогій;
6. даступнасць – ЭАР даступны з любой прылады з доступам у інтэрнэт, ЭВМК даступны з лакальнай сеткі ўніверсітэта і інш.

Сучаснае грамадства непарыўна звязана з працэсам хуткага змянення, таму адным з прыярытэтных напрамкаў з'яўляецца інфарматызацыя адукацыі з прымяненнем сучасных мультымедыя і ўкараненнем інавацыйных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Гэтая тэндэнцыя адпавядае мэтам сённяшняй адукацыі, якая патрабуе бесперапыннага абнаўлення метадаў, сродкаў і форм арганізацыі навучання.

***Спіс выкарыстаных крыніц***:

*1. Новейший философский словарь / Сост. А. А.Грицанов. — Мн.: Изд. В. М.Скакун, 1998. — 896 с.*

*2. Положение об электронном образовательном ресурсе учебной дисциплины [Электронный ресурс]. – Режим доступа: .https://www.bsuir.by/m/12_100229_1_147321.pdf. – Дата доступа: 04.04.20221*

*3. Наўроцкая, І. В. Беларуская мова : культура маўлення. Электронны вучэбна-метадычны комплекс [Электронны рэсурс] / І. В. Наўроцкая. - Мінск : Электронная бібліятэка БДУІР, 2013.*

*4. Хуторской, А. В. Метапредметный подход в обучении : Научно-методическое пособие / А. В. Хуторской. — М.: Издательство «Эйдос»; Издательство Института образования человека, 2012. — 73 с.*

*5. Львов, М.Р. Словарь-справочник по методике преподавания русского языка : пособие для студентов педагогических вузов и колледжей / М.Р. Львов. – Москва: Изд. Центр Академия : Высш. шк., 1999. – 271 с.*